Монцік В.М., студ. гр. 514 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гуд П.А.,
канд. гіст. навук, прафесар

**СВЯТОЧНАЯ ПІРАТЭХНІЧНАЯ ДЗЕЯ, ЯК СІНТАЗ РОЗНЫХ ВІДАЎ МАСТАЦТВАЎ**

Самым выразным і яскравым сродкам у любым свяце з`яўляецца піратэхнічнае дзеянне. Яго вельмі часта выкарыстоўваюць як частку святочнага дэкору, а таксама як самастойнае відовішча. І вельмі часта піратэхнічнае дзеянне з`яўляецца самай яскравай кропкай свята.

Піратэхнічныя дзей маюць вельмі цікавую гісторыю развіцця, на аснове якой сучасныя феерверкі, адроджаныя і трансфармаваныя, увасоблены ў найцікавейшыя піратэхнісныя спектаклі. «Калядныя зоркі» (г.Мінск, 1992 – 1995 гг.), «Агні спадчыны» (г. Паставы, 1994 – 2003 гг.), «Вадзяная феерыя» (г.Нясвіж, 1998 г.), «Агні народаў сусвету» (г.Гродна, 2002 г.), «Вогненная сімфонія» (г.Калінкавічы, 2003 г.), «Карнавал весялосці» (г.п.Воранава,2003 г.) і інш. Гэтыя прыклады яскрава паказалі, што ў нашай краіне існуе нацыянальная школа феерверкаў, якая грунтуецца на гістарычным вопыце нашых продкаў.

Сёння феерверк гэта неад`емная частка кожнага свята: дні нараджэнні, банкеты, вяселлі. Піратэхнічныя вырабы бытавога назначэння, пры іх выкарыстанні не патрабуюць спецыяльных ведаў і навыкаў, таму іх можна набыць вельмі проста. З-за гэтага даступнасць піратэхнічных вырабаў павялічылася, а навагоднія святы, увогуле, не ўяўляюцца без святочнай іллюмінацыі і яскравага феерверка.

Менавіта таму трэба каб арганізатары святочных мерапрыемстваў ведалі пра развіццё піратэхнічнага мастацтва, пра сродкі выкарыстання яго ў свяце, пра сімволіку колера і разнавіднасці феерверкаў. Вялікая складанасць у тым, што на сённяшні дзень прафесіянальныя піратэхнічныя вырабы каштуюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі дарага, а сапраўдныя піратэхнічныя шоў адбываюцца толькі на вялікіх святах, а ў правінцыяльных гарадах, увогуле, раз у дзесяцігоддзі. Вельмі мала спецыялістаў, якія прафесійна займаюцца гэтай найцікавейшай справай.

Але, як сведчаць сучасныя назіранні, піратэхнічнае мастацтва набывае ўсеагульный характар. А ўжо наша мэта, як маладых спецыялістаў, не толькі захаваць традыцыі, а ўзнесці іх на высокі мастацкі ўзровень, каб прыцягнуць featur рознабаковую і рознаўзроставую аўдыторыю. За апошні час сярэднегадавое выкарыстанне феерверкаў падвоілася. Хутчэй за ўсё, сучасная тэхніка яшчэ не знайшла замену цудоўнаму майстру, які ўпрыгожвае начное неба яркімі фантанамі рознакаляровых агнёў.

Феерверк – гэта комплекс піратэхнічных вырабаў, складзеных у пэўную мастацкую кампазіцыю. Феерверкі класіфікуюцца па розных прыкметах;

1. Па прынцыпу дзеяння: -Ракеты, - Батарэі салютаў, - Петарды,

- Пнеўмахлапушкі, - Рымскія свечкі, - Дзённыя феерверкі, - Фестывальныя шары.

2. Па ўзроўню працы адрозніваюць: наземны, паркавы і верхні. Ужо з назвы можна зразумець на якой вышыні адбываецца праца піратэхнічнага зарада. Да наземных ставяцца феерверкі якія працуюць на вышыні да 15 метраў. У гэтую катэгорыю ўваходзяць: падпаленыя надпісы і фігуры, агністыя фантаны і выбліскі. Наступны, паркавы феерверк, з максімальнай вышынёй спрацоўвання да 50 метраў. Для правядзення паркавага феерверка выкарыстоўваюць не прафесійныя батарэі салютаў, якія адносяцца да бытавых феерверкаў (3 клас небяспекі), фэставальныя шары, і невялікія ракеты. І заключны ўзровень - верхні, з вышынёй запуска да 300 метраў. Да яго ставяцца прафесійныя зарады і буйныя ракеты з бытавой піратэхнікі.

Пры планаванні феерверка, піратэхнікі камбінуюць розныя ўзроўні, паслядоўнасць запуску, камбінацыі эфектаў, інтэнсіўнасць залпаў, дасягаючы з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогай аднаго працягласць працы праграмы, а з дапамогай іншага відовішчнасць і аб'ём.

Па форме ўвасаблення яны падзяляюцца на дэкаратыўныя і тэматычныя. Дэкаратыўны феерверк – гэта мастацкая піратэхнічная кампазіцыя, якая аздабляе пэўныя святочныя дзеі (бытавы, канцэртны, паркавы салют). Тэматычны – мастцка-асэнсаваныя вобразныя, сімвалічныя, піратэхнічныя дзеі, якія адлюстроўваюць пэўныя падзеі ў жыцці грамадства, альбо асобы. У тэматычных феерверках, разам з піратэхнікай, выкарыстоўваюць музыку, пластыку, слова, святло і інш.. Што дазваляе нам разглядаць святочныя піратэхнічныя дзеі, як сінтэз розных відаў мастацтва. Арганічнае злучэнне розных відаў мастацтваў у адзінае цэлае, якое эстэтычна арганізуе матэрыяльнае і духоўнае асяродзе чалавека. Паняцце "сінтэз мастацтваў" мы ўяўляем, як стварэнне новай якаснай мастацкай з'явы. Іх вобразнае, кампазіцыйнае адзінства, агульны ўдзел у мастацкай арганізацыі прасторы і часу, абумоўленасць маштабаў, прапорцый, рытму спараджаюць у мастацтве якасць, здольныя аказваць на чалавека шматбаковае эмацыянальнае ўздзеянне.

Феерверкі і ілюмінацыі былі найболей яркай формай сінтэзу мастацтваў у XVIII стагоддзі: апроч піратэхнікі яны ўключалі ў сябе партрэтны і тэатральны жывапіс, скульптуру, архітэктуру, літаратуру, музыку. У дні адмысловых святаў святло разліваўся па ўсіх вуліцах. Піратэхнічная, дэкаратыўная частка спектакля, якая ляжала ў аснове феерверка, складаецца з мноства разнастайных ракет і складаных светлавых фігур -колаў, фантанаў, каскадаў, служыла фонам для выяўленчых дэкарацый. Гэта былі сюжэтныя карціны двух родаў: "планы" феерверка і шчыты ілюмінацій.

"План" феерверка ўяўляў раму з драўляных планак вышынёй да 5-7 метраў. На раму з дапамогай шнура, прапітанага піратэхнічнымі **складамі**, або селітравымі свечкамі наносіўся малюнак - складаная кампазіцыя з некалькіх фігур з абавязковым дэвізам, якія тлумачаць сэнс алегорыі. Падчас дзеяння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шнур падпальваўся, і ў начной цемры выступаў разнаколерны малюнак, за ім, дапаўняючы яго, прытрымліваўся другі.

Другім элементам, якія перадаюць змест, была ілюмінацыя. Шчыты ілюмінацыі звычайна выконваліся ў выглядзе рамы, абцягнутай палатном. Часам шчыт ілюмінацыя выконваўся іншым спосабам - з дошак, выразаных па малюнку дэкарацыі, паказваючы храм, альтанку, грот. У такім разе каганцы або ліхтары ўмацоўваліся па контуры размаляванай дашчанай дэкарацыі. Шчыты былі ў сярэднім вышынёй 6-10 метраў, але ў асаблівых святочных выпадках дасягалі вялікіх памераў.

У дэкарацыю ўключалася таксама скульптура. Полыя фігуры качак, вадзянікаў канёў, дэльфінаў, злепленыя з палатна і паперы, плавалі, рухаліся па вадзе, круціліся з дапамогай ракет-квакераў. На балюстрадзе змяшчаліся фігуры антычных багаў- і герояў, выразаныя з дрэва і «пристойною краскою, златом и серебром» распісаныя. Месца правядзення вогненнай феерыі павінна было быць акружана вадой у кааб пазбегнуть пажараў. Гэта забяспечвала таксама магчымасць шырокага агляду дзеяння.

На беларусі, значнымі прыкладамі святочнай піратэхнічнай дзей, як сінтэз розных відаў мастацтва, з'яўляюцца: «Калядныя зоркі» (г.Мінск, 1992 – 1995 гг.), «Агні спадчыны» (г. Паставы, 1994 – 2003 гг.), «Вадзяная феерыя» (г.Нясвіж, 1998 г.), «Агні народаў сусвету» (г.Гродна, 2002 г.), «Вогненная сімфонія» (г.Калінкавічы, 2003 г.), «Карнавал весялосці» (г.п.Воранава,2003 г.) і інш. Гэтыя прыклады яскрава паказалі, што ў нашай краіне існуе нацыянальная школа феерверкаў, якая грунтуецца на гістарычным вопыце нашых продкаў.

Выбар тэхнічных сродкаў афармлення феерычных прадстаўленняў на сённяшні дзень вельмі шырокі - да іх ставяцца сцэнічныя модульныя канструкцыі, асвятляльная тэхніка, святлодыёдныя экраны, гукаўзмацняльныя прылады, лазеры, і шматлікія іншыя, якія можна выкарыстоўваць, як на адкрытых пляцоўках, так і ў памяшканнях. Аднак пры агульнай распрацаванасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблем тэхнічнага абсталявання, пры шырыні іх ужывання іх класіфікацыя, іх тыпалогія, метады ўжывання тэхнічных сродкаў для выканання сцэнічных задач рознага характару і ступені складанасці, так і не атрымалі ў прафесійнай літаратуры належнага асвятлення.

Спіс літаратуры:


1. Барышев Г. І. «Тэатральная культура Беларусі 18ст.», Мн.: 1992г;
2. Беларуская энцыклапедыя: у 18 тамах, том 12.- Мн.: БелН, 2001г.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мн.: БелН, 1995г.

3. Бельскі, Ткачоў «Вялікае мастацтва артылерыі», Мн.: 1986г;
4. Гуд П.А. «Тэхналогія стварэння свята»: Вучэб. Дапам. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т. культуры, 2004г;
5. Дмитриевский А. Церковные торжества на православнов востоке. С. – П., 1929).
6. Киркор А. А. «Черты минувших дней», « Жывописная Россия», том 4. Царство Польское. – С.-Пб., 1896;
7. Мальдзіс А. «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 ст.», Мн.: 1988г;
8. Немиро О.В. «В город пришёл праздник» – Л.: Художник РСФСР, 1973;
9. Всеваладскі – Генгрос. История русского театра, М.: 1929;

Сыракомля У. «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», Мн.: 1992 г.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ